Мы лічым, што такую працу трэба праводзіць пастаянна. На наш погляд, гэта дазволіць больш глыбока спасцігнуць і саму культуру народа, а значыць, і выхаваць павагу і любой да яе.

Артыкул падрыхтаваны пры фінансавай падтрымцы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь (№ДР1209).

**Бібліяграфічныя спасылкі**

1. Яковлева, Е. Л. Методологические основания изучения национальной кухни как феномена гастрономической культуры [Электронный ресурс] / Е. Л. Яковлева // Этническая культура / Ethnic Culture. – 2020. – № 2. – С. 92–96. – Режим доступа: https://journalec.com/cv/article/75332/discussion_platform. – Дата доступа: 11.04.2023.

2. Еременко, О. И. Лингвокультурологическое комментирование онимов на уроках литературного чтения / О. И. Еременко // Начальная школа. – 2016. - № 7 – С. 30-33.

УДК 37.016

# СІСТЭМА ВЫВУЧЭННЯ БЕЛАРУСКІХ НАРОДНЫХ ЛЕГЕНД У ПАЧАТКОВАЙ ШКОЛЕ

А. В. Субаткевіч
*УА «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»;*
*Мінск (Рэспубліка Беларусь)*
*Навук. кір. – А. С. Васілеўская, к.філ.н., дацэнт*

# THE SYSTEM OF STUDYING BELARUSIAN FOLK LEGENDS IN PRIMARY SCHOOL

A. V. Subatkevich
*Belarusian State Pedagogical University named after Maxim Tank*
*Minsk (Republic of Belarus)*
*Scientific adviser – E. S. Wasilewskaya, Dr. PhD Associate professor*

У артыкуле апісваецца мэты і задачы вывучэння народных легенд у пачатковай школе, аналізуецца сістэма заданняў да іх.

The article describes the goals and objectives of studying folk legends in primary school, analyzes the system of tasks for them.

Ключавыя словы: легенды, літаратурнае чытанне, малодшыя школьнікі.
Keywords: legends, literary reading, younger students.

У сучаснай метадычнай літаратуры ўсё часцей узнікае пытанне пра неабходнасць фарміравання этнічнай ідэнтычнасці, пад якой разумеюць “не

только осознание, но и восприятие, оценивание, переживание своей принадлежности к этнической общности” [1, с. 19]. Адным з найбольш дзейсных фактараў развіцця этнічнай ідэнтычнасці, па меркаванні даследчыкаў, з’яўляецца фальклор.

Важнай і неад’емнай часткай беларускага фальклору выступаюць легенды і паданні. Легенда з'явілася тады, калі чалавек пачаў гаварыць. Легенда, як і паданні, – створаны вусна аповед, які мае ўстаноўку на рэальнасць. Легенда – гэта апавяданне пра якую-небудзь гістарычную падзеі, выкладзенае ў мастацкай, паэтычнай форме. Калі разглядаць паняцце легенды шырэй, то можна сказаць, што гэта – фальклорны твор з элементамі цудоўнага.

Па змесце і па выяўленчых магчымасцях легенда адрозніваецца і ад падання, і ад казкі. У параўнанні з паданнем, легендзе характэрна гіпербалізацыя, у ёй выкарыстоўваюцца фантастычныя элементы ў абмалёўцы падзей з жыцця, казачныя, міфалагічныя матывы змешаны з побытам людзей. У адрозненні ад казкі, мэта легенда– перадаць праўду. Падзеі, пра якія распавядаецца ў легендзе, – гэта гістарычныя падзеі, якія адбыліся на самой справе.

Па змесце і функцыі легенды можна падзяліць на наступныя групы: 1) этыялагічныя, або касмаганічныя: яны расказваюць пра паходжанне сусвету, нябесных свяціл, зямлі, чалавека, жывёл раслін і іншых з’яў прыроды; 2) этнасацыяльныя, або гісторыка-культурныя: у іх апавядаецца пра паходжанне плямён, народаў, класаў і розных сацыяльных і культурных з’яў; 3) духоўна-этычныя расказваюць пра бога і святых, паходжанне свят, пра розныя вераванні [2, с. 22].

Даследчыкі адзначаюць, што легенды былі не самымі пашыранымі фальклорнымі жанрамі. “Носьбітамі паданняў і легенд заўсёды было абмежаванае кола людзей. Іх выканаўцамі былі найбольш састарэлыя члены роду, грамады, захавальнікі гістарычных традыцый” [2, с. 25]. Можна сказаць, што легенды і паданні з’яўляюцца найбольш складаным для разумення і засваення жанрамі.

Першае знаёмства з легендай на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі адбываецца ў 4 класе на ўроках рускай літаратуры (літаратурнага чытання), калі малодшыя школьнікі знаёмяцца з беларускімі легендамі “Бяздоннае багацце” і “Нёман і Лоша” [3, с. 15-19]. Гэты ўрок накіраваны на фарміраванне літаратурных ўяўленняў вучняў пра жанр легенды, плануецца, што вучні ў працэсе вывучэння легенды навучацца выяўляць жанравыя асаблівасці гэтага фальклорнага жанру [4, с. 30].

Перад чытаннем твора навучэнцам прапануецца пазнаёміцца з кароткімі тэарэтычнымі звесткамі: “*Разновидностью рассказа является легенда. В легендах, как правило, рассказывается о событиях давно минувших дней. Они соединяют в себе правду и фантазию, в них есть вымысел, выдумка. Это роднит их со сказкой. Содержание легенд может быть связано как с великими событиями, так и с повседневной жизнью. В легенде всегда присутствует фантастический, чародейный элемент”* [3, с. 15].

У прыведзеным тэксце ўвага звяртаецца на такія жанравыя асаблівасці легенды, як дакладнасць звестак пра гістарычныя або побытавыя падзеі і наяўнасць у творах фантастычных элементаў.

Легенда “Бяздоннае багацце”, якая вывучаецца ў 4 класе, адносіцца да тыпу этнасацыяльных (гісторыка-культурных), якія распавядаюць пра паходжанне плямён, народаў, класаў і розных сацыяльных і культурных з’яў.

Пасля знаёмства з тэкстам легенды вучні павінны адказаць на пытанні па змесце: *Які выпадак адбыўся з князем Яраславам на паляванні? Прачытайце апісанне гэтага эпізоду ў тэксце; Як князь вырашыў аддзячыць загоншчыку? Пацвердзіць свой адказ словамі з тэксту; Растлумачце сэнс выказвання "твае нашчадкі да дзясятага калена будуць валодаць гэтай зямлёй"; Які падарунак зрабіў князь Ранцэвічу?*

Аўтары дапаможніка акцэнтуюць увагу на метафарычную назву легенды: *Як вы думаеце, чаму легенда мае такую назву?; Прыдумайце легендзе іншую назву, якая б таксама адлюстроўвала сэнс тэксту.*

Пытанні *Што лічылі бяздонным багаццем князь Яраслаў і загоншчык Ранцэвіч?* і *Якое бяздоннае багацце абраў загоншчык? Знайсці адказ у тэксце легенды* павінны наблізіць навучэнцаў да разумення ідэі твора.

Аднак, на наш погляд, прапанаваная сістэма пытанняў і заданняў не дазваляе рэалізаваць мэты ўрока: на жанравыя асаблівасці твора ўвага не звяртаецца. На наш погляд, да пытанняў, змешчаных у падручніку, варта дадаць наступныя:*Чаму гэты твор можна назваць легендай? Назавіце ў легендзе “Бяздоннае багацце” фантастычныя і рэальныя элементы*. Гэтыя пытанні дапамогуць вучням зразумець характэрныя рысы жанру легенда і далей не блытаць яе з казкай або паданнем.

Легенда “Нёман і Лоша” адносіцца да тыпу этыялагічныя (касмаганічных), у якіх распавядаецца пра паходжанне з’яў прыроды. Адразу пасля знаёмства з тэкстам легенды вучні павінны адказаць на пытанні па змесце:*Пра што распавядае легенда?; Які характар быў у Нёмана, а які — у Лошы? Знайдзіце адказ у тэксце.*

Адзначым, што два пытанні да легенды накіраваны на фарміраванне лінгвакультуралагічных ведаў: *Як характар рэк адбіўся на іх руху? Прачытайце дзеясловы, якія перадаюць рух рэк; Знайдзіце на карце Беларусі раку Нёман. Вызначыць, у якое мора ўпадае рака.* Для таго, каб адказаць на гэтыя пытанні, трэба ўзнавіць веды, набытыя на занятках па дысцыпліне “Чалавек і свет”.

На ўроках беларускай літаратуры (літаратурнага чытання) у 4 класе навучэнцы знаёмяцца з легендай “Адкуль песня беларуская”, якая адносіцца да тыпу гісторыка-культурных [5, с. 105].

Плануецца, што напрыканцы ўрока научэнцы на практычным узроўні засвояць значэнне слова *легенда*, навучацца вызначаць у легендзе народныя выразы [4, с. 110]. Аднак сістэма пытанняў, прадстаўленая ў падручніку, не дазваляе рэалізаваць пастаўленую мэту.

Звестак па тэорыі жанра ў дапаможніку не прапануецца, бо вучні 4 класа ўжо пазнаёміліся з азначэннем легенды раней, на уроках рускай літаратуры. А прапанаваныя аўтарам падручніка пытанні накіраваны на засваенне зместу легенды, на разуменне характару герояў: *Па якой прычыне два першыя героі чулі розныя гукі зямлі?; Хто з падарожнікаў пачуў гукаў больш? Што можна сказаць пра яго асобу? Паразважайце; Адкажыце, адкуль песня беларуская.*

У якасці задання творчага характару вучням прапануецца, па жаданні, прыдумаць працяг легенды.

Асобныя легенды і паданні ўключаны ў змест прадмета “Чалавек і свет” у 4 класе: пра паходжанне горада Турава [6, с. 72], Крэўскага замка [6, с. 62], возера Свіцязь [6, с. 19] і інш. Безумоўна, што мэта іх вывучэння – у цікавай і займальнай форме пазнаёміць навучэнцаў з найбольш важнымі геаграфічнымі аб’ектамі Беларусі. І ў тэксце падручніка падобныя творы называюцца *паданнямі*.

Такім чынам, прааналізаваўшы падручнікі пачатковай школы можна выдзеліць некалькі адметнасцей вывучэння легенд у пачатковай школе. Першае, што хочацца адзначыць, што праграмай не прадугледжана знаёмства з народнымі легендамі ў 1-3 класах. З легендай як жанрам вуснай народнай творчасці навучэнцы знаёмяцца толькі ў чацвёртым класе.

Другая адметнасць звязана з тым, што на ўроках беларускай літаратуры легенды вывучаюцца разам з іншымі фальклорнымі жанрамі – паданнямі і былінамі – без вылучэння адметнасцей кожнага з іх. Такі падыход прыводзіць да блытаніны ў разуменні і ўспрыманні фальклорных тэкстаў, што пацвярджаецца вынікамі праведзенага намі даследавання.

І трэцяя адметнасць звязана з тым, што практыкаванні, якія прапануюцца ў падручніках, даволі аднатыпныя: спачатку дзеці павінны прачытаць легенду, потым адказаць на 3-6 пытанняў па змесце легенды, і толькі ў некаторых выпадках вучням прапануецца выканаць творчае заданне *(прыдумаць працяг, новую назву, знайсці на карце пэўны горад або раку).*Такі падыход не дазваляе раскрыць асаблівасці жанру, яго лінгвакультуралагічны патэнцыял.

Легенды і паданні здаўна лічацца спосабам захавання гістарычных, этыялагічных ведаў таго ці іншага народа. Яны, як ніякі іншы жанр, здольны сфарміраваць у маленькага чалавека ўсведамленне пра сябе як пра прадстаўніка пэўнага этнасу. Аднак, на наш погляд, падыходы да вывучэння легендаў і паданняў у пачатковай школе трэба ўдасканальваць.

Артыкул падрыхтаваны пры фінансавай падтрымцы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь (№ДР1209).

**Бібліяграфічныя спасылкі**

1. Русский и белорусский фольклор как фактор формирования этнической идентичности младших школьников / Ю. В. Бражник [и др.]. – Смоленск : Смол.гуманитар. ун-т, 2016. – 362 с.

2. Грынблат, І. Я. Легенды і паданні / І. Я. Грынблат // Легенды і паданні / АН БССР, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мінск : Навука і тэхніка, 1983. – С. 5–35.

3. Воропаева, В. С. Литературное чтение: учебное пособие для 4 класса учреждений общего среднего образования с белорусским и русским языками обучения : в 2 ч. / В. С. Воропаева [и др.]. – Минск : Национальный институт образования, 2018. – Ч. 1. – 145 с.

4. Примерное календарно-тематическое планирование : пособие для учителей учреждений общего среднего образования с русским языком обучения / В. С. Воропаева [и др.]. – Минск : Национальный институт образования, 2017. – 254 с.

5. Жуковіч М. В. Літаратурнае чытанне : вучэбны дапаможнік для 4 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання : у 2 ч. / М. В. Жуковіч. – Мінск : Нацыянальны інстытут адукацыі, 2018. – Ч. 1. – 139 с.

6. Паноў, С. В. Чалавек і свет, Мая Радзіма – Беларусь : вучэбны дапаможнік для 4 класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання / С. В. Паноў, С. В. Тарасаў. – Мінск : Выдавецкі цэнтр БДУ, 2018. – 171 с.